**Сяргей Габрусевіч, Святлана Марозава**
(Гродна)

## Прафесар Ігнат Анацэвіч — пачынальнік беларускай гістарыяграфіі

З якога часу пачынаецца сістэматычнае навуковае вывучэнне гісторыі Беларусі? У савецкія часы пачатак айчыннай гістарыяграфіі выводзілі з другой паловы XIX ст. Аднак на пачатку 1990-х гадоў з'явіўся шэраг публікацый, аўтары якіх звязвалі зараджэнне айчыннай гістарыяграфіі з інтэлектуальнай дзейнасцю прафесараў Віленскага універсітэта М. Бабро́ўскага, І. Даніловіча, І. Анацэвіча, І. Ярашэвіча, гісторыка і археолага Т. Нарбута. „Станаўленне нацыянальнай гістарыяграфічнай канцэпцыі звязана, — адзначаў Міхась Біч, — з зараджэннем і развіццём беларускай нацыянальнай ідэі і нацыянальнага руху. Да ліку першых прафесійных гісторыкаў, якія заклалі падмурак нацыянальнай канцэпцыі сваёй Радзімы, адносіліся прафесары Віленскага універсітэта М. Баброўскі, І. Даніловіч, І. Анацэвіч, І. Ярашэвіч, Т. Нарбут. На фарміраванне яе станоўча ўплывалі даследаванні па этнаграфіі Беларусі і фальклору беларусаў”[1].

Годам раней у артыкуле „Народзіны беларускай нацыянальнай ідэі” Алег Латышонак менавіта з гэтымі імёнамі звязаў вытокі беларускай нацыянальнай свядомасці. Ён пісаў: „Працэс станаўлення сучаснай беларускай нацыі прынята называць „адраджэннем”, а вытокі беларускай нацыянальнай думкі бачацца пры гэтым у творчасці Чачота, Баршчэўскага, Рыпінскага, Дуніна-Марцінкевіча. Але былі ў іх і папярэднікі”[2].

Хто былі гэтыя папярэднікі? „Яшчэ на пачатку XIX ст. знайшліся людзі, — гаворыць А. Латышонак, — якія здолелі нацыянальна

[1] М. Біч, *Аб нацыянальнай канцэпцыі гісторыі і гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь*, „Беларускі гістарычны часопіс”, 1993, № 1, с. 16.

[2] А. Латышонак, *Народзіны беларускай нацыянальнай ідэі*, „Спадчына”, 1992, № 1, с. 9.

вызначыць Беларусь. Былі гэта Міхайла Баброўскі, Ігнат Даніловіч ды іншыя прафесары Віленскага універсітэта”[3].

Падсумоўваючы вынік свайго даследавання, А. Латышонак сфармуляваў тры тэзы, якія для тагачаснага чытача не маглі быць бясспрэчнымі. І гэта зразумела, паколькі беларускі чытач у той час амаль нічога не ведаў ні пра жыццё, ні тым больш пра навуковую дзейнасць гэтых людзей. „Першае: дзве суседнія паловы XVIII і XIX стст. звязаны паміж сабою так непарыўна, што пра ніякае „адраджэнне” толькі ў XIX ст. гаварыць немагчыма. Калі нават не фальшывае самое паняцце „адраджэнне”, дык фальшывая яго перыядызацыя і несапраўдныя яго героі. Другое: уласна беларускую нацыянальную ідэю стварылі не шляхецкія паэты і рэвалюцыянеры, а гістарычна адукаваныя спакойныя паповічы (...). Трэцяе: як Галіччына для Украіны, „Малая Літва” для Літвы, так і пруская Беласточчына для Беларусі адыграла выключную ролю ў станаўленні нацыянальнай свядомасці”[4].

Да ліку гістарычна адукаваных спакойных паповічаў належыў прафесар Ігнат Анацэвіч. Ён нарадзіўся 25 жніўня 1780 года ў вёсцы Малая Бераставіца на Гродзеншчыне. Дата нараджэння І. Анацэвіча дакладна ўстанаўліваецца па аўтабіяграфіі, складзенай ім у 1828 годзе для савета Віленскага універсітэта.

Праз усё жыццё пранёс Ігнат Анацэвіч светлыя ўспаміны пра родную вёску, дзе прайшло яго дзяцінства: „Ля крыніцы цудоўнай вады над ракой у прыгожым закутку падвешаны дамок і ўся гаспадарка, аборы, гумны, лямусікі і гароднінны агародзік, а паблізу гладкая гара і празрысты гаёк”[5].

Сваё малабераставіцкае паходжанне Ігнат Анацэвіч пры кожным зручным выпадку падкрэсліваў. Невыпадкова псеўданім „Жэгота з Малой Бераставіцы”, дадзены яму віленскім універсітэцкім атачэннем, утрымліваў указанне на месца паходжання.

Ігнат паходзіў з сям’і уніяцкага святара. Бацька Сымон быў настаяцелем Малабераставіцкай царквы. Гэта быў чалавек суровы, але ў вышэйшай ступені справядлівы, спартанскай маралі. Звестак аб маці Ігната няма. У сям’і было трое сыноў: Міхаіл, Антон і Ігнат — і традыцыя пастырскага служэння. Прадбачачы, што царкоўная унія будзе знішчана, прыходскае уніяцкае духавенства пасля 1772 г. стала хрысціць сваіх дзяцей па лацінскаму абраду, пакі-

3 Там жа.
4 Там жа, с. 14.
5 J. Iwaszkiewicz, *Ignacy Żegota Onacewicz — historyk Litwy: Z dziejów dawnego Uniwersytetu Wileńskiego*, wydał L. Żytkowicz, [w:] *Studia i materiały z dziejów nauki polskiej*, Warszawa1961, seria A, zeszyt 4, s. 44-45.

даючы аднаго толькі сына, звычайна старэйшага, у грэчаскім абрадзе. Ігнат Анацэвіч быў ахрышчаны па лацінскаму абраду.

Сацыяльнае паходжанне І. Анацэвіча без сумневу паўплывала на ягоныя адносіны да вучобы і працы. „Бедныя святарскія сыны, клеймаваныя мянушкай „паповічаў”, — піша А. Латышонак, добра разумелі, што толькі поспехам у навуцы змогуць дабіцца прызнання з боку панічоў і настаўнікаў”[6].

Аналізуючы дзейнасць выпускнікоў Віленскага універсітэта, якія выявілі сябе ў грамадстве, знаўца яго гісторыі прафесар Людвік Яноўскі прыйшоў да наступнай высновы. Землеўладальніцкая шляхта, чыіх сыноў шмат вучылася ва універсітэце, дала Вільні мала вучоных, гэтак жа, як і саслоўе мяшчан і сялян. Затое былі яшчэ два саслоўі, якія пастаўлялі універсітэту знакамітых прафесараў. Былі гэта дробная шляхта і уніяцкае духавенства. Як сведчаць рапарты візітатараў школ, менавіта „паповічы” былі ў іх самымі здольнымі і працавітымі вучнямі. Не могучы разлічваць на чыюсьці падтрымку, яны імкнуліся выбіцца на больш высокія прыступкі сацыяльнай лесвіцы толькі з дапамогай навукі. Балазе эпоха Асветніцтва ім такую магчымасць давала. „Паповічы” вылучаліся ў сярэдніх школах, выбіваліся на высокія пасады ў Віленскім універсітэце, а што самае галоўнае, — гаворыць Л. Яноўскі, — прафесарскае прызванне лічылі сваім. Такімі былі прафесары Міхаіл Баброўскі, Ігнат Даніловіч, Платон Сасноўскі, Міхаіл Гамаліцкі, Ігнат Анацэвіч, а таксама Антон Марціноўскі.

Першыя веды малабераставіцкі „паповіч” набываў дома. У 9-гадовым узросце яго аддалі ў Ваўкавыскае вучылішча. Там ён паспяхова навучаўся сем гадоў (1789-1796). Па выніках 1792/1793 навучальнага года атрымаў узнагароду. Прозвішча Ігната Анацэвіча лічыцца ў спісе вучняў гэтай навучальнай установы за 1796 г., аднак, што яна сабой уяўляла, сёння мы звестак не маем.

Наступным крокам у навуку была акруговая школа ў Гродне — тады павятовым цэнтры Слонімскай губерні. У гэтай установе прагны да навук Ігнат навучаўся ў 1796/1797 навучальным годзе. Указам Паўла І Гродзенская акруговая школа была зачынена і на яе базе 29 верасня 1797 г. адкрылі павятовае вучылішча, якім апекаваліся дамініканцы. Вось чаму ў літаратуры памылкова ўказваецца, што Ігнат Анацэвіч вучыўся ў Гродзенскім павятовым вучылішчы.

Далейшыя жыццёвыя шляхі павялі Ігната на Беласточчыну, якая незадоўга да таго стала Нова-Усходняй Прусіяй. Новую правінцыю сваёй дзяржавы з такой назвай стварыла Прусія на тэрыто-

[6] А. Латышонак, *Народзіны беларускай нацыянальнай ідэі*, с. 11.

рыі Рэчы Паспалітай, якая па трэцім падзеле увайшла ў яе склад. На чале правінцыі быў пастаўлены міністр — маёр кавалерыі Фрыдэрык Леапольд барон фон Шротэр. Ён выконваў тут функцыі намесніка прускага караля Фрыдрыха ІІ.

Для падрыхтоўкі новых педагагічных кадраў, якія бачыліся галоўным рухавіком рэформы адукацыі, міністр заснаваў пры мясцовай гімназіі ў Элку настаўніцкую семінарыю. Ігнат Анацэвіч стаў на два гады (1801-1802) семінарыстам у навучальнай установе, якая рыхтавала педагогаў для Усходняй Прусіі, Беластоцкай і Плоцкай абласцей.

Методыка навучання ў Элку была эфектыўнай і энергічнай. Ахвочыя да навук семінарысты ўжо праз год гаварылі і пісалі панямецку, разумелі лекцыі на нямецкай мове. Настаўніцкая семінарыя таксама дала Ігнату грунтоўныя веды па лацінскай мове. Але галоўнымі прадметамі былі педагогіка і дыдактыка. Тут шліфаваліся яго педагагічныя здольнасці. Тут жа ён далучаўся да таямніц гісторыі.

Сусед Ігната па пакоі і сябар М. Стоц, успамінаючы пра яго, пісаў, што гэты высокага росту, плячысты, надзвычайнай сілы семінарыст, які гаварыў хутка і, здавалася, нібы шапялявіў, найбольш прыкладаўся да гісторыі. Пабеленыя сцены і дзверы іх пакою ён спісаў гістарычнымі фактамі і храналагічнымі табліцамі. Так пачыналася фарміраванне спецыяліста, які выпрацаваў здзіўляючую храналагічную памяць і ведаў гісторыю не павярхоўна, а глыбока і ў падрабязнасцях. Тады ж пачала выяўляцца ў семінарыста І. Анацэвіча і здольнасць заварожваць музай Кліо людзей з бліжэйшага акружэння. Гледзячы на яго, як успамінаў усё той жа М. Стоц, і ў мяне з’явілася ахвота цалкам аддацца гісторыі[7].

Праз год вучобы абодва сябры атрымалі ўзнагароду, якую прыслаў ім з Берліна міністр Шротэр. Дарэчы, дзякуючы Шротэру І. Анацэвіч атрымаў каралеўскую стыпендыю на двухгадовае навучанне ў Кёнігсбергскім універсітэце.

Сёння дакладна вядома, што ў Кёнігсберг І. Анацэвіч прыехаў у ліпені 1802 г. (хоць у літаратуры звычайна называецца 1803 г.). Яго здольнасці і руплівасць былі высока ацэнены кёнігсбергскай прафесурай, што дазволіла прадоўжыць каралеўскую стыпендыю яшчэ на два гады.

Такім чынам, у 1802-1806 гадах І. Анацэвіч вывучаў педагогіку,

[7] M. Stoc, *Kilka słów o szkołach Polskich za Pruss południowych*, „Orędownik naukowy”, 1845, nr 13, s. 104.

права, фінансы, палітычную эканомію, дыпламатыю, фізіку, хімію ў Кёнігсбергскім універсітэце. Асабліва зацікавіўся, выйшаўшы на крыніцы, якіх тут знаходзілася шмат, гісторыяй Прусіі і Літвы.

У Кёнігсбергу будучы вучоны яшчэ больш палюбіў гісторыю, і яна становіцца часткай яго жыцця. Кёнігсбергская прафесура пазнаёміла яго з гісторыяй і метадалогіяй еўрапейскай гістарычнай навукі, яе тагачаснымі плынямі, філасофскім і эрудыцкім, з новым гісторыка-крытычным метадам. Менавіта тут адбывалася станаўленне І. Анацэвіча як гісторыка-прафесіянала, пачынаўся яго шлях гісторыка-даследчыка, вызначылася сфера навуковых інтарэсаў — гісторыя Вялікага Княства Літоўскага.

Па заканчэнні універсітэта І. Анацэвіч атрымаў пасаду выкладчыка польскай мовы, пачаткаў рускай мовы, а пазней — яшчэ і пасаду афіцыйнага перакладчыка прускага караля.

Як каралеўскі перакладчык у 1807 г. ён смела выступіў на абарону расійскіх купцоў, чыю маёмасць канфіскавалі захапіўшыя горад французскія войскі. Чакаць дапамогі купцам не было адкуль — расійскі консул пакінуў горад. Ігнат Анацэвіч вёў перамовы з французскімі ўладамі, хадайнічаў перад самім Напалеонам аб зняцці секвестру з расійскіх магазінаў і кампенсацыі страт іх гаспадарам.

Дапамога І. Анацэвіча расійскім купцам была заўважана на самым высокім узроўні. Восенню 1808 года праездам праз Кёнігсберг на Эрфуртскі кангрэс міністр замежных спраў Расіі граф Мікалай Пятровіч Румянцаў узнагародзіў яго гадзіннікам, абяцаў паінфармаваць пра яго ўчынак імператара і выклапатаць больш высокую ўзнагароду. Вяртаючыся ў Расію, граф ізноў сустрэўся з І. Анацэвічам. Зразумеўшы, што такі вучоны, здольны ды малады выкладчык можа прынесці вялікую карысць Расіі, М. П. Румянцаў схіляў яго да вяртання на Радзіму.

У 1809 годзе І. Анацэвіч пакінуў Кёнігсберг. Сёння невядома прычына, акрамя запрашэння М. П. Румянцава, што заставіла перспектыўнага выкладчыка і вучонага назаўсёды пакінуць горад, які адкрыў дзверы ў навуковы свет і „высокія" кабінеты. Можна толькі меркаваць, што гэтая прычына была грунтоўнай, бо і сам Кёнігсберг, і яго універсітэт шмат што значылі для нядаўняга „паповіча".

Каля года (1809-1810) І. Анацэвіч жыў у маёнтку М. П. Румянцава ў Гомелі, які прыняў яго гасцінна, а галоўнае адкрыў свае багатыя зборы для навуковых пошукаў. Даследчыцкая праца ў архіве і бібліятэцы графа М. П. Румянцава была першай справай І. Анацэвіча па вяртанні ў Расію. Сам госць сваю працу ў знакамітай бібліятэцы акрэсліў наступным чынам: „Шукаў гістарычныя звесткі пра розныя правінцыі, якія належаць Расійскай дзяржаве, важныя

звесткі, што датычаць літоўскай гісторыі, зрабіў значныя поспехі ў расійскай мове"[8].

Наступным крокам прафесійнага станаўлення І. Анацэвіча быў Віленскі універсітэт. 1 верасня 1810 г. прагны да ведаў педагог і даследчык быў залічаны на „маральнае аддзяленне" (юрыдычны факультэт) Віленскага універсітэта. Тады яму было 30 гадоў. Слухаў курсы гісторыі, права, палітычнай эканоміі, а таксама астраноміі, фізікі, хіміі. Праз год вучобы, 24 верасня 1811 г., пасля здачы спецыяльнага экзамену атрымаў у выніку тайнага галасавання сямнаццаццю галасамі „за" пры адным „супраць" званне магістра філасофіі. Было таксама аднадушна прызнана, што ён мае вялікія веды па ўсеагульнай гісторыі і асабліва па гісторыі народаў і ў гэтай сферы можа працаваць.

Улічыўшы грунтоўную падрыхтоўку новага магістра, савет Віленскага універсітэта даручыў яму выкладанне на публічных курсах для дзяржаўных служачых усеагульную гісторыю, права і палітэканомію. Першыя ж выступленні выявілі ў І. Анацэвічы здольнага і красамоўнага лектара. Гэта быў добры пачатак потым так трагічна завершанай яго працы ва універсітэце.

У 1813 г. магістр І. Анацэвіч атрымаў запрашэнне на пасаду настаўніка Беластоцкай гімназіі.У гімназіі ён выкладаў старажытныя мовы і літаратуру, потым — французскую мову. У 1816 г. атрымаў і сваю любімую ўсеагульную гісторыю, а таксама права і нямецкую мову, а праз год — прызначэнне на пасаду памочніка дырэктара гімназіі. Менавіта ў беластоцкі перыяд жыцця завяршыўся працэс фармавання І. Анацэвіча як прафесійнага гісторыка.

Беласток пачатку XIX ст. быў глухой правінцыяй. Адрэзаны ад навуковых асяродкаў, вучоны адчуваў сябе адзінока і сумаваў: не было патрэбнай навуковай літаратуры, захопленых навукай людзей, не хапала нават падручнікаў. Праўда, і сам ён, заняты настаўніцкай, а потым яшчэ і адміністрацыйнай працай, не мог нават і марыць пра навуковыя даследаванні — не было вольнага часу.

Але аднойчы яму вельмі пашанцавала. Падчас паездкі у Вільню, хутчэй за ўсё па службовых справах, пазнаёміўся з незвычайным чалавекам, вучоным, намеснікам прафесара кафедры ўсеагульнай гісторыі Іаахімам Лялевелем. Паміж імі завязалася перапіска, якая доўжылася 15 гадоў, аж да выезду І. Лялевеля ў эміграцыю. Сёння яна з'яўляецца цікавай гістарычнай крыніцай не толькі для вывучэння іх біяграфій, але і інтэлектуальнага руху эпохі, станаўлення

[8] Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў у Санкт-Пецярбургу (далей: РДГА), ф. 1151, воп. 2, 1835 г., спр. 52, арк. 78.

беларускай гістарычнай навукі.

У рукапісным аддзеле Бібліятэкі Віленскага універсітэта захоўваецца ліст І. Лялевеля, пісаны 13 чэрвеня 1816 г. да Ігната Анацэвіча ў Беласток[9], — ці не адзін з першых у іх ліставанні. Ліст прасякнуты пачуццём павагі да беластоцкага калегі, добразычлівасці да яго, шчырага сяброўства. Не падлягае ніякаму сумненню: І. Лялевель бачыў у І. Анацэвічы гісторыка-прафесіянала, роўнага сабе, і імкнуўся да супрацоўніцтва з ім.

У лісце з Беластока, 28 сакавіка 1817 г., Ігнат Анацэвіч піша Іаахіму Лялевелю: „Няшмат вартая такая гісторыя, якая займаецца сухім апавяданнем падзей або вылічэннем, хто, калі, дзе і як доўга спаў на троне, колькі часу марнаваў на апрананне, паляванне і іншыя захапленні. Сутнасць гісторыі заключаецца ў трапным вылучэнні прычын уздыму і заняпаду народаў, у раскрыцці дзеючых спружын. Падзеі запісаныя, але іх ключ знаходзіцца ў людскіх сэрцах. У такім яўленні заключаецца важнасць і карысць гісторыі, тады яна — настаўніца для правіцеляў і народаў, настаўніца жыцця". Беластоцкі выкладчык шкадаваў, што ў школах гісторыю ўспрымаюць за бесцань: „Кожнага матэматыка, фізіка, юрыста да гэтага лічылі здольным да выкладання гісторыі; непадрыхтаваныя настаўнікі не маглі і не хацелі заахвоціць вучняў палюбіць чароўную Кліо"[10].

У Беластоцкай гімназіі ў І. Анацэвіча з'яўляюцца першыя гісторыка-педагагічныя ідэі (аб ролі навучальных устаноў у вывучэнні гісторыі краю, аб забеспячэнні іх вучэбнай літаратурай, аб падборы кадраў выкладчыкаў-гісторыкаў) і першыя выдавецкія праекты: падрыхтоўкі сумесна з І. Лялевелем папулярнага падручніка па ўсеагульнай гісторыі, выдання распрацаваных І. Анацэвічам генеалагічных табліц вялікіх князёў літоўскіх і каралёў польскіх.

З выкладчыка гісторыі ў Беластоцкай гімназіі І. Анацэвіч восенню 1818 года па запрашэнню савета Віленскага універсітэта крочыў на найвышэйшую, як для гісторыка Расійскай імперыі таго часу, навукова-адміністрацыйную пасаду — пасаду выконваючага абавязкі загадчыка кафедры гісторыі ў старажытнейшым з усходнееўрапейскіх універсітэтаў. Гісторыя становіцца яго жыццём. „У маёй галаве знаходзіцца вялікі ўбіты цвік і ўсе мае думкі круцяцца каля гэтага цвіка — а гэты цвік гістарычны, як часоў мінулых, так і цяперашніх", — пісаў пра сябе пазней, 26 чэрвеня 1841 г., І. Анацэвіч калегу універсітэцкаму прафесару Міхаілу Гамаліцкаму[11].

9 Рукапісны аддзел Бібліятэкі Віленскага універсітэта, ф. 12, спр. 145, арк. 4-5.

10 J. Iwaszkiewicz, *Ignacy Żegota Onacewicz — historyk Litwy...*, s. 51.

11 Там жа, с. 100.

Віленскае дзесяцігоддзе прафесара І. Анацэвіча (1818-1828) — гэта час, калі ў Польшчы, Літве і Беларусі разгортваўся „гіганцкі гістарычны рух” і было ўсеагульнае ажыўленне навуковымі пошукамі на ніве „літоўскасці”, якая аблогам ляжала з часоў Войцеха Каяловіча (1609-1677).

Праца ў старажытнейшым Віленскім універсітэце адкрывала перад гісторыкам шырокія гарызонты для навуковай і педагагічнай дзейнасці. Гэтыя магчымасці ён паспяхова выкарыстоўваў. Апошняе не было б магчымым, калі б І. Анацэвіч не быў прызнаны як вучоны вялікага калібру. Ніхто не мог сумнявацца ў гэтым, нават калі б вельмі захацеў. У такім прафесійным і абмежаваным асяроддзі, якім быў Віленскі універсітэт на пачатку XIX стагоддзя, чалавек не мог дасягнуць павагі, калі не быў майстрам сваёй справы. Тут працавалі такія знакамітыя прафесары як І. Даніловіч, І. Лялевель, М. Баброўскі і інш. На такім фоне было цяжка стаць роўным, а тым больш вылучыцца. Усе сучаснікі І. Анацэвіча прызнаюць, што ён гэтага змог дасягнуць.

„Сапраўднай красой аддзялення палітычных навук быў тады Жэгота Анацэвіч, адзін з найбольш сімпатычных і заслужаных віленскіх прафесараў, — пісаў яго біёграф і даследчык гісторыі Віленскага універсітэта Л. Яноўскі. — Прыбыўшы ў Вільню (1818 г.), стаў адным са слупоў гуманітарных навук, якія стаялі нязменна ніжэй за дакладныя [навукі], і толькі спробамі і талентам плеяды, якая складалася з Даніловіча, Алдакоўскага, Галухоўскага, Анацэвіча, з Лялевелем на чале, учынілі раўнамерны стан навуковасці ў Вільні”[12]. На працягу трох гадоў, ад 20 верасня 1818 г. па 1821 г., І. Анацэвіч чытаў ва універсітэце курс усеагульнай гісторыі.

І. Анацэвіч валодаў здольнасцямі выдатнага лектара, што вельмі важна для універсітэцкага прафесара. Праўда, замяніць знакамітага І. Лялевеля яму было няпроста. Аднак выбар І. Анацэвіча на пасаду намесніка прафесара ўсеагульнай гісторыі быў вельмі ўдалым. Ён не шмат саступаў І. Лялевелю ў эрудыцыі, начытанасці, грунтоўнасці ведаў гістарычнай літаратуры і сумежных навук. Акрамя таго, валодаў нямецкай метадалогіяй гуманітарных навук і вытанчаным уменнем даследавання крыніц. А як знаўцу мясцовай, літоўскай і беларускай гісторыі яму не бало ў той час роўных.

Прафесар І. Анацэвіч быў першым, хто прышчапіў у Віленскім універсітэце цікавасць да гісторыі Вялікага Княства Літоўскага і любоў да айчыннай мінуўшчыны. „Дзіўная рэч, — пісаў выкладчык, — 250 гадоў мінула з часу заснавання літоўскага універсітэта

[12] L. Janowski, *W promieniach Wilna i Krzemieńca*, Wilno 1923, s. 99.

— ніводзін з вучоных, літоўскім хлебам шчодра забяспечаны, не адказаў удзячнасцю сваім карміцелям, ніводнай кніжкі па гэтаму прадмету не купілі ў бібліятэку, нікому і ў галаву не прыйшло пацікавіцца лёсам, які зведалі край і людзі, якія ў ім жывуць”[13].

Менавіта ў гэтыя гады прафесар І. Анацэвіч увёў у навучальную праграму курса ўсеагульнай гісторыі важную навацыю. Гісторыя Вялікага Княства Літоўскага разглядалася да яго ў курсе ўсеагульнай гісторыі, які чытаўся 4 гадзіны ў тыдзень, і гублялася ў моры інфармацыі. З уласнай ініцыятывы і бескарысліва Ігнат Анацэвіч распрацаваў асобны курс айчыннай гісторыі і чытаў яго па паўтары гадзіны ў тыдзень. Гэта быў першы спецыяльны універсітэцкі курс, прысвечаны мінуламу беларускага і літоўскага народаў. Варта адзначыць, што І. Лялевель насцярожана ставіўся да такога роду лекцый. Такія ж адносіны да курса гісторыі беларускага народа характэрныя і для кіраўніцтва Віленскага універсітэта гэтых гадоў. У архіве захаваліся звесткі, якія сведчаць, што адміністрацыя універсітэта часта не давала для чытання гэтага курса аудыторый, і прафесару І. Анацэвічу прыходзілася чытаць яго студэнтам на калідоры. Такім чынам, прафесар І. Анацэвіч быў у поўным сэнсе гэтага слова піянерам у распрацоўцы курса гісторыі беларускага і літоўскага народаў.

Першы універсітэцкі курс гісторыі ВКЛ, які выкладаў І. Анацэвіч, дайшоў да нас, на жаль, толькі ў абрыўках, якія тым не менш сведчыць, як грунтоўна гэты першакласны знаўца гісторыі Беларусі і Літвы вучыў моладзь. „Заахвоціць (...) закахацца ў чароўную Кліо” — галоўны прынцып яго выкладчыцкай дзейнасці. Ён прапаноўваў студэнтам цікавыя тэмы для распрацоўкі. Аднаго намовіў пісаць пра Вітаўта, другога заахвочваў даследаваць канфлікт шляхты з Сапегамі на мяжы XVII-XVIII стст.

Не толькі на публічных лекцыях, але і ў прыватных размовах ён заахвочваў моладзь да працы над гісторыяй краю, дапамагаў парадамі, бескарысліва даваў карыстацца матэрыяламі са сваіх багатых рукапісных збораў. Хоць выкладаў ён на польскай мове, але умеў абуджаць у беларускіх і літоўскіх студэнтаў цікавасць да сваёй культурнай спадчыны. Прафесар пераконваў студэнтаў у час канікул шукаць даўнія кнігі і рукапісы. Гэтыя пошукі давалі добрыя вынікі — вучні вярталіся з канікул, нагружаныя старажытнымі кнігамі, дакументамі, зрэдку нават і пергаментнымі. Гэтыя рарытэты яны дарылі прафесару[14]. На думку яго біёграфа Януша Івашкевіча,

[13] J. Iwaszkiewicz, *Ignacy Żegota Onacewicz — historyk Litwy*, s. 107.
[14] Там жа, с. 106-107.

менавіта І. Анацэвіч апладатварыў Адама Міцкевіча задумай „Гражыны" і „Конрада Валенрода"[15].

Але 1 сакавіка 1821 года ў выніку конкурсу І. Анацэвіч страціў кафедру і курс усеагульнай гісторыі. Савет універсітэта даручыў яму чытанне курсаў расійскай статыстыкі і дыпламатыі.

Курс статыстыкі, за які пад прамым уціскам універсітэцкага савета ўзяўся прафесар І. Анацэвіч, ён таксама чытаў бліскуча. У першай трэці XIX ст. універсітэцкі курс статыстыкі меў мала агульнага з сучасным разуменнем паняцця „статыстыка" як колькасным улікам масавых з'яў. Ён прадугледжваў фармаванне сістэматычных ведаў аб асноўных характарыстыках краіны: тэрыторыі, складзе насельніцтва, эканамічных рэсурсах, дзяржаўным ладзе, фінансах, праве — аб усім, што складае сілу або слабасць кожнай дзяржавы, ад чаго яна становіцца багацейшай або бяднейшай. Статыстыка вывучала не саму дзейнасць людзей, а вынікі іх дзейнасці.

Гэты прафесар быў скарбам для слухачоў, якія адзываліся пра яго з абажаннем, — пісаў пра І. Анацэвіча Людвік Яноўскі. — Не абмяжоўваючыся межамі свайго прадмета, Анацэвіч даваў разнастайныя звесткі, выкладаў, зразумела, пераканаўча і павучальна. Яго лекцыі абуджалі шчырае зацікаўленне да ўсяго цыкла навук, бо прафесар пастаянна ўступаў у галіну сумежных навук, асабліва варушыў праблемы гісторыі, якую любіў найбольш. Вельмі красамоўныя словы прафесара Анацэвіча заўсёды былі пранікнутыя любоўю да ўсеагульнага дабра краю, таксама пашанай яго мінулага, такім чынам прыцягвалі ўвагу і выпрацоўвалі перакананні. Яго адданасць свайму прызванню, арыгінальнасць і самастойнасць поглядаў, багацце звестак і валоданне прадметам рабілі яго лекцыі невыказна прывабнымі[16]. Статыстыка ў руках Анацэвіча, — сведчыць ананім, — была адным з найбольш прывабных прадметаў ва універсітэце і карысных для разумовага развіцця. Гэты непараўнальны настаўнік статыстыкі ніколі не стамляў, таму што ўсё ўмеў ажывіць, зацікаўліваючы нас дасканалай методыкай выкладання і прыгожым спосабам выказвання. Ён болей дбаў пра абуджэнне думкі студэнтаў, чым аб фактах. Свае лекцыі любіў прыпраўляць гумарам. Час ад часу кідаў у аудыторыю выслоўі, каламбур, з'едлівыя досціпы, якія потым доўга паўтараліся студэнтамі. Чытаў лекцыі па памяці і вельмі клапаціўся пра выразнасць мовы. Студэнты ахвотна спяшаліся ў лекцыйную залу, ведаючы, што іх заўсёды чакала грунтоўная лекцыя і новыя звесткі[17].

15 Там жа, с. 116.
16 L. Janowski, *W promieniach Wilna i Krzemieńca*, Wilno 1923, s. 100.
17 Там жа.

28 чэрвеня 1827 г савет універсітэта сакрэтным галасаваннем 14-цю галасамі з 15-ці абраў І. Анацэвіча экстраардынарным прафесарам. Двумя тыднямі раней І. Анацэвіч за выслугу гадоў атрымаў чын калежскага асэсара, да якога быў прадстаўлены яшчэ ў 1819 г.

Аднак праз кароткі час І. Анацэвіча спасцігла катастрофа. У пачатку 1828 г. ва універсітэце была выкрыта тайная студэнцкая арганізацыя „Патрыёты Айчыны". На допытах студэнты паказалі, што да стварэння арганізацыі іх падштурхнулі лекцыі І. Анацэвіча.

17 лютага прафесара арыштавалі ва ўласнай хаце, канфіскавалі ўсе паперы. Сярод іх былі гістарычныя працы даследчыка, „абуральныя вершы і іншыя паперы заганнага зместу", перапіска, у тым ліку з канцлерам М. П. Румянцавым і інш.

Следства не знайшло доказаў сувязі І. Анацэвіча са студэнцкім таварыствам. Ніякіх доказаў не аказалася і ў канфіскаваных у яго паперах. Праз некалькі дзён яго вызвалілі, паперы вярнулі, але не ўсе. Зніклі лісты універсітэцкага сакратара Мержаеўскага, якія выкрывалі яго як раскрадальніка казённых грошай, а таксама матэрыялы да гісторыі ВКЛ і інш.

Зняважаны хатнім арыштам і вобыскам, да глыбіні душы абураны прафесар 3 сакавіка напісаў прыватны ліст да дэкана медыцынскага факультэта і выконваючага тады абавязкі рэктара Мікалая Мяноўскага, у якім абвінавачваў яго з Мержаеўскім у арганізацыі гэтага фарса, а таксама адкрыта абвінаваціў іх у злоўжываннях.

„Арганізавалі вы варты пасмешышча фарс, якога наступстваў ніхто і прадбачыць не мог. Паверце, міласцівы гасудар, — пагражаў гісторык, — што я болей ведаю і магу, чым вы спадзяецеся (...) з усёй выдуманай хітрасцю недалёка з Мержаеўскім пойдзеце (...). Пападзецеся самі ў яму, якую для іншых падрыхтавалі (...) нямала часу падрыхтоўваўся я да гэтай барацьбы, для якой маю дастаткова зброі"[18]. З ліста вынікала, што І. Анацэвіч добра ва ўсім паінфармаваны, што ён здолее дамагчыся сатысфакцыі сваёй крыўды і ніякія меры не прымусяць яго маўчаць далей.

Хоць гэты ліст насіў прыватны характар, М. Мяноўскі паказаў яго рэктару. 2 красавіка 1828 года адбылося пасяджэнне універсітэцкага савета. Яго пратакол захоўваецца ў Літоўскім дзяржаўным гістарычным архіве ў Вільні. Звычайны запіс у кнізе пасяджэнняў універсітэцкага савета. Незвычайны выракам: „Такога чалавека нельга цярпець ва універсітэцкім саслоўі. Каб яго ўчынак як прыклад не зрабіў спакусы ў вучнёўскай моладзі і не расстройваў парадку, з такімі цяжкасцямі і намаганнямі заведзенага (...)". Да ат-

[18] РДГА, ф. 1151, воп. 2, 1835 г., спр. 52, арк. 3 адв.-5.

рымання санкцыі куратара і правіцеля заходніх губерняў вялікага князя Канстанціна лічыць, што І. Анацэвіч знаходзіцца пад судом[19].

14 мая паліцыя ўварвалася да яго ў хату і, не даўшы часу ўпакаваць самыя патрэбныя рэчы, а тым больш уладкаваць незавершаныя справы, схапіла і пад канвоем вывезла з Вільні. 16 мая яго даставілі ў Гродна. Гродзенскі губернатар рапартаваў тады ў Вільню аб прыняцці выгнанніка ў сваё ведамства: „Магістр філасофіі Віленскага універсітэта Анацэвіч для ўсялення на радзіме дастаўлены"[20].

17 мая ссыльнага прывезлі ў Малую Бераставіцу — цэнтр уніяцкага прыхода, у якім настаяцелем быў родны брат Ігната, Міхаіл, і здалі „пад строгі паліцэйскі нагляд крынскага ключвойта". Адлучацца з месца пасялення было забаронена. Услед прыслалі з універсітэта жалаванне — 42 рублі 31 капейку срэбрам[21].

Судовы працэс над прафесарам І. Анацэвічам закончыўся толькі ў 1836 г.

Прычынай жыццёвых нягод, якія абрынуліся на гісторыка, у многім стаў ён сам, яго характар.

Ігнат Анацэвіч быў яркай, неардынарнай асобай, значнай для свайго пакалення. Гэта аксіёма. Ужо з першага знаёмства ён выклікаў да сябе сімпатыю. Найперш знешнім выглядам. Гэта быў чалавек высокага росту, плячысты, надзвычайнай сілы, як характарызаваў яго сябар па семінарыі М. Стоц. Прыкладна такім жа запомніўся ён і знакамітаму І. Лялевелю: „Складзены сільна, з развітым лобам, надзвычайнай памяццю, адораны кемлівасцю"[22].

Усе без выключэння сучаснікі адзначалі знешнюю прыгажосць І. Анацэвіча. Да нашага часу дайшоў яго партрэт, выкананы мастаком В. Н. Родзігам паводле малюнка К. Жукоўскага. Партрэт пісаўся з натуры. Яго рэпрадукцыя была змешчана пасля смерці вучонага у пецярбургскім „Roczniku Literackim". Перад намі фізічна моцны чалавек. Гэтая моц ірвецца вонкі так, што яе з вялікай цяжкасцю ўтрымоўвае верхні гузік сурдута. Твар прыгожы і разумны, у поглядзе адкрытасць і цвёрдасць. Ледзь стуленыя губы нібы гавораць: я не буду да цябе падлізвацца, але на мяне ты можаш разлічваць. Велічная галава. Высокі і чысты лоб мысліцеля. Густыя, спадаючыя на плечы валасы (гэта таксама істотна).

19 Літоўскі дзяржаўны гістарычны архіў, ф. 721, воп. 1, спр. 1195, арк. 11 адв.-12.

20 Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Гродне (далей: НГАБ), ф. 1, воп. 3, спр. 186, арк. 2.

21 НГАБ, ф. 1, воп. 3, спр. 186, арк. 4-6.

22 J. Lelewel, *Przygody w poszukiwaniach i badaniu rzeczy narodowych polskich*, Poznań 1858, s. 33.

Не падлягае сумневу, што знешнія рысы І. Анацэвіча значна паўплывалі на яго характар, вызначылі складаны шлях яго жыцця, педагагічнай і навуковай дзейнасці.

З аднаго боку, яны працавалі на яго імідж, адкрывалі магчымасць для сяброўства з цікавымі і ўплывовымі людзьмі. Ужо падчас навучання у Кёнігсбергу ён карыстаўся папулярнасцю ў асяроддзі універсітэцкіх прафесараў. У 1808 г. яго, маладога выкладчыка, калегі абралі гаспадаром балю, які універсітэт ладзіў у гонар знакамітых людзей дзяржавы і караля Фрыдрыха Вільгельма III, які выказаў яму тады „ласкавыя словы і адабрэнне”[23]. У тым жа годзе І. Анацэвіч пазнаёміўся з расійскім канцлерам М. П. Румянцавым, які абяцаў яму сваю дапамогу і заступніцтва. Паміж імі склаліся вельмі добрыя адносіны.

З другога боку, прываблівы знешні выгляд садзейнічаў фармаванню І. Анацэвіча як чалавека ўладнага і задзірыстага. Дастаткова было яму з’явіцца ў любой кампаніі, як тут жа ўсе звярталі на яго ўвагу, да яго выказванняў прыслухоўваліся. А гаварыць ён умеў і язык меў такі, што, здавалася, у яго ў роце жыве змяя.

У рапарце на імя рэктара Віленскага універсітэта (1813 г.) дырэктар Беластоцкай гімназіі Станіслаў Бакоўскі пры станоўчай характарыстыцы І. Анацэвіча зазначыў аднак, што ён „з’яўляецца некалькі запальчывым, сварлівым і ганарыстым сваімі ведамі і здольнасцямі”[24].

У адносінах з людзьмі жорсткі, — характарызуе яго Я. Івашкевіч, — безаглядна рубае праўду ўсім у вочы, і таму ўвогуле не быў многімі любімы. Да сяброў добры, сардэчны, гатовы да ўсякага роду дапамогі, верны да магілы”. У гэтых жа фарбах малюе І. Анацэвіча і Станіслаў Мараўскі: „У абыходжанні, гэта значыць у манеры, — нямецкі хлопец і нават нахабнік, але шчыры, адкрыты, добрасумленны, так што яму гэта нахабства, усюль, дзе толькі быў, да твару”[25]. З апошнім цяжка пагадзіцца. Рэзкасць І. Анацэвіча, безагляднасць у размовах прыносіла яму шмат непрыемнасцяў.

Страціўшы ў 1821 г. пасаду прафесара кафедры гісторыі, ён едзе ў Пецярбург „шукаць справядлівасці і паратунку”, што не дадало яму аўтарытэту сярод калег. У выніку сяброўскіх хадайніцтваў прафесараў І. Лялевеля і І. Даніловіча, якія любой цаной хацелі ўтрымаць І. Анацэвіча ва універсітэце, савет даручыў яму выкладанне расійскай статыстыкі, якую ён ужо апрабаваў у мінулым

[23] РДГА, ф. 1151, воп. 2, 1835 г., спр. 52, арк. 77 адв.

[24] J. Iwaszkiewicz, *Ignacy Żegota Onacewicz — historyk Litwy...*, s. 50.

[25] S. Morawski, *Kilka lat młodości mojej w Wilnie. 1818-1825*, Warszawa 1959, s. 346.

годзе, і дыпламатыі, як навукі да гісторыі блізкай. Не пасвечаны ў захады сяброў, І. Анацэвіч убачыў у гэтай пастанове жаданне скампраметаваць яго як вучонага, пазбавіць набытай у навуковым свеце рэпутацыі, вёў сябе дзёрзка, задзірліва. Не хацеў і слухаць пра гэтыя дысцыпліны. Зразумела, ён не атрымаў падтрымкі ні рэктара, ні куратара Адама Чартарыйскага, які, хутчэй за ўсё, пад уплывам непрыязных да І. Анацэвіча асоб, лічыў яго чалавекам неспакойным, інтрыганам і на ўсе яго просьбы адказваў адмовай. Рэктар загадаў да 1 верасня ўтрымаць выплату прафесару заробку. Прыціснуты нястачай, прыгнечаны крэдыторамі, бурны І. Анацэвіч быў зламаны.

Нястрыманасць, безагляднасць ва ўчынках была адной з прычын выдалення І. Анацэвіча з універсітэта ў 1828 годзе.

Гвалт, які спазнаў апальны прафесар, яго не зламаў, а, наадварот, надаў энергіі на далейшую барацьбу. Ён быў перакананы, што справядлівасць — раней ці пазней — возьме верх. „Мая душа, — пісаў Ігнат Анацэвіч 10 ліпеня 1828 г. з Малой Бераставіцы І. Лявелю, — моцна загартавалася (...). Ніводнага са сваіх апошніх крокаў не шкадую (...). Пакуль душа ў целе, буду помсціць за беззаконне”[26]. Гэты факт, як дарэчы і многія іншыя, характарызуюць І. Анацэвіча як чалавека цвёрдага, не здольнага на кампрамісы і нават упартага.

Разам з тым у многіх сітуацыях І. Анацэвіч прадстае як чалавек мяккі, добры, здольны да выбачэнняў і нават сентыментальны. Менавіта такім ён быў у адносінах да роднай вёскі Малой Бераставіцы, родзічаў і сяброў.

Ішоў 1836 год. Ігнат Анацэвіч ужо другі год жыў Пецярбургу.

Атрымаўшы вырак Сената, які вызваліў яго ад суда і следства, на радзіму ён ужо не вярнуўся. Разлічваць на атрыманне там працы не прыходзілася. Найлепшае, чаго мог чакаць — гэта жыццё на міласэрным, але чужым хлебе беднага святара Міхаіла ў Малой Бераставіцы. Вяртацца ў Вільню, пазбаўленую універсітэта, не мела сэнсу. Пецярбург жа прываблівеў сталічнымі архівамі і бібліятэкамі — добрым месцам навуковай працы. Спадзяваўся таксама з дапамогай сваіх сувязяў у навуковым свеце атрымаць тут якуюсьці пасаду.

Дзякуючы пратэкцыі пецярбургскіх сяброў, пазбаўлены сродкаў існавання прафесар атрымаў пасаду ў толькі што створанай Археаграфічнай камісіі з акладам 1 500 рублёў асігнацыямі (400 срэбраных рублёў у год). Сярод членаў гэтай камісіі І. Анацэвіч вылучаўся як найбольш актыўны і падрыхтаваны навуковец.

[26] J. Iwaszkiewicz, *Ignacy Żegota Onacewicz — historyk Litwy...*, s. 89.

З 1834 г. Ігнат Анацэвіч, паралельна з працай у Археаграфічнай камісіі, выконваў абавязкі памочніка бібліятэкара Румянцаўскага музея. Пасля смерці колішняга Ігнатавага апекуна Мікалая Пятровіча Румянцава (1754-1826) яго унікальная калекцыя: кнігі, рукапісы, творы мастацтва, нумізматычныя калекцыі, археалагічныя і этнаграфічныя матэрыялы — была перавезена з Гомеля ў Пецярбург і на яе аснове ў 1831 г. заснаваны Румянцаўскі музей.

З часам здароўе Ігната Анацэвіча, хоць і моцнае ад прыроды, але падарванае зменлівасцямі лёсу, пагоршылася. Не спрыяў яму і пецярбургскі клімат. Восенню 1844 г. яго зваліла смяртэльная хвароба — вадзянка.

21 лістапада 1844 г. гісторык склаў завяшчанне. Сваёй сціплай маёмасцю распарадзіўся наступным чынам: пляменніку Вацлаву завяшчаў усю сваю ўласнасць, пляменніку Яраславу — кнігі, што знаходзіліся ў Малой Бераставіцы, астатнім пляменнікам і родным — ад 50 да 100 рублёў срэбрам. І. Анацэвіч прасіў у завяшчанні прыхільных да яго сенатара Канстанціна Бараздзіна і тайнага саветніка Пятра Будкова ўзяць, у выпадку неабходнасці, яго радню пад сваё заступніцтва. Сваіх родных ён пераконваў мець у асаблівай увазе: гонар, дабрачыннасць, здароўе, навукі і сямейнае каханне. Хай кожны з іх шукае шчасця ў сумленным занятку, у добрых паводзінах, у беражлівасці (ашчаднасці), узаемна падтрымліваючы адзін аднаго парадамі і дапамогай. Выказваў жаданне быць пахаваным у Малой Бераставіцы, ля свайго любімага брата, брэсцкага каноніка Міхаіла. Пляменніка Вацлава абавязаў паставіць на магіле брата помнік, заказаны ў Пецярбургу[27].

18 лютага 1845 г. у 10 гадзін раніцы Ігната Анацэвіча не стала. Да апошняга моманту ён захоўваў свядомасць. Сціплае пахаванне яго адбылося на Смаленскіх могілках 20 лютага.

І. Анацэвічу давялося жыць у пераломную, лёсавызначальную для яго зямлі і народа эпоху. Са сконам Вялікага Княства Літоўскага адбываліся перакройванне яго адміністрацыйна-тэрытарыяльнай карты, прававой базы, канфесійнай структуры. Сацыяльная трансфармацыя, змена ідэалогіі, руйнаванне ўсіх старых устояў і, як вынік, нараджэнне шляхецкай рэвалюцыйнасці. Шмат якія з тагачасных падзей і змен, якіх так багата прыйшлося на жыццё „Жэготы з Малой Бераставіцы", закранулі яго сям'ю, сяброў, знаёмых, яго асабіста. Гэта, відаць, давала І. Анацэвічу асаблівае

27 Рукапісны аддзел Бібліятэкі Літоўскай акадэміі навук, ф. 18, спр. 185/12, арк. 32-32 адв.

адчуванне гістарычнасці, зменлівасці і значнасці часу. На яго малой радзіме, яго суайчыннікамі (С. А. Панятоўскі, Т. Касцюшка) неаднойчы вырашаўся тады лёс значнай часткі Еўропы: Беларусі, Літвы, Польшчы, Украіны, Расіі. Адчуванне значнасці месца сваёй Айчыны ў агульнагістарычным кантэксце, відаць, і абумовіла выбар вучоным сваёй галоўнай жыццёвай місіі — даследаванне, выкладанне і папулярызацыя айчыннай гісторыі.

Знікненне з карты некалі магутнай еўрапейскай дзяржавы, якім было Вялікае Княства Літоўскае; працэс яго дэмантажу, апошняй кропкай якога была адмена Статута 1588 г. — праявы велічы гэтай дзяржавы, тлумачаць зразумелую цікавасць вучонага да тых часоў, калі гэта дзяржава знаходзілася на вяршыні сваёй магутнасці, — да XIII-XVI стст.

Працуючы ў рэчышчы рамантычнай гістарыяграфіі, якая культывавала цікавасць да сярэдніх вякоў, нярэдка ідэалізуючы і паэтызуючы гэты перыяд гісторыі, І. Анацэвіч умела карыстаўся прыёмамі рамантычнага пісьма для аднаўлення каларыту беларуска-літоўскага сярэднявечча. Ключавым для рамантыкаў быў прынцып гістарызму, якім карыстаўся і І. Анацэвіч. У аснову сваёй навуковай творчасці ён паклаў гісторыка-крытычны метад. Жыццёвым і навуковым крэда даследчыка быў прынцып: „Ісціна, толькі ісціна, нічога, акрамя ісціны”.

Аб’ектыўна ацаніць прафесара Ігната Анацэвіча як гісторыка і яго ўклад у беларускую гістарычную навуку, на наш погляд, немагчыма без адказу на два пытанні. Па-першае, наколькі грунтоўна ён даследаваў гісторыю сваёй Айчыны? Па-другое, што зроблена ім у гэтым накірунку?

Даследчыкі спадчыны вучонага галоўнай яго заслугай лічаць шматгадовую працу над гісторыяй Літвы. У чытача, незнаёмага з яго працамі, можа скласціся ўражанне, што ён даследаваў гісторыю Літвы ў сучасным разуменні. І тады залічэнне Ігната Анацэвіча да першых прафесійных айчынных гісторыкаў, як гэта робіць Міхась Біч, можа здацца грубай нацяжкай. Але нацяжкі тут няма.

Працуючы над гісторыяй Літвы, прафесар І. Анацэвіч меў на ўвазе Літву ў гістарычным разуменні, а менавіта Вялікае Княства Літоўскае, эканамічным, культурным і ў значнай ступені палітычным ядром якога былі беларускія землі. За доказам гэтага няма патрэбы хадзіць далёка. Адным з першых раздзелаў яго працы „Погляд на гісторыю Вялікага княства Літоўскага” з’яўляецца невялікі, але вельмі красамоўны раздзел „Межы краю”. У ім гаворыцца: „Сёння да ліку літоўскіх губерняў адносяцца толькі Віленская і Гродзенская. Літва ж гістарычная мела межы ад Дзвіны, Дона, Волгі

і Днястра аж да Балтыйскага мора”[28]. Вось над гісторыяй гэтай Літвы, адной з самых значных у XIII-XV стст. дзяржаў Еўропы, якая ляжала на памежжы ўсходне- і заходнееўрапейскай цывілізацый, і працаваў амаль усё жыццё Ігнат Анацэвіч.

Ідэя стварыць капітальную працу па гісторыі Вялікага Княства Літоўскага, гэта значыць, па гісторыі беларускага і літоўскага народаў, хутчэй за ўсё, узнікла ў І. Анацэвіча ў 1818-1921 гадах, калі ён быў прафесарам кафедры ўсеагульнай гісторыі. „Пакуль не будзе дакладнай і грунтоўна распрацаванай гісторыі паасобных народаў, — заяўляў І. Анацэвіч, — думаць пра дасканалую ўсеагульную гісторыю немагчыма”[29]. Кожны народ, на яго думку, павінен разумець адметнасць гістарычнага шляху сваіх продкаў і сваю адметнасць „у лабірынце іншых народаў”. Гісторыю ВКЛ ён разглядаў як частку агульнага сусветнага працэсу, шукаў вытокі дзяржаўнасці беларусаў і літоўцаў.

Усё сваё жыццё вучоны збіраў у мясцовых і замежных, дзяржаўных, канфесійных і прыватных архівах і бібліятэках крыніцы па гісторыі Вялікага Княства Літоўскага. Ён выяўляў іх у дакументасховішчах шасці сучасных краін: Прусіі (Кёнігсберг), Беларусі (Гродна, Ліда, Навагрудак, Шчорсы, Дзятлава, Слонім, Лаўрышаў, Дзярэчын, Рось, Ваўкавыск, Свіслач, Вялікая Бераставіца і інш.), Літвы, Польшчы (Варшава, Пулавы і інш.), Латвіі (Рыга, Дэрпт) і Расіі (Пецярбург). На 1827 г. прафесар меў вялізныя матэрыялы для рэканструкцыі гісторыі ВКЛ XIII-XVI стст. Але катастрофа 1828 г. перакрэсліла яго грандыёзную задуму.

Найбольш інтэнсіўнай і плённай была збіральніцкая дзейнасць І. Анацэвіча ў апошні, пецярбургскі перыяд жыцця. У сталічных архівах і бібліятэках (Публічнай бібліятэцы, бібліятэцы Галоўнага штаба і інш.) ён знайшоў неацэнныя, не кранутыя рукой даследчыка дакументальныя скарбы для сваёй любімай „літоўскай гісторыі”, у тым ліку вывезеныя з яго радзімы пасля 1795 і 1831 гг.

Плёнам збіральніцкай працы прафесара стала унікальная рукапісная калекцыя арыгіналаў і копій дакументаў, выпісак з гістарычных крыніц, а таксама зробленых на іх аснове запісак. Калекцыя арыгіналаў складалася з унікальных крыніц па гісторыі Усходняй і Цэнтральнай Еўропы позняга сярэднявечча і ранняга новага часу: папскія булы, граматы магістра Лівоніі, польскіх каралёў, вялікіх князёў літоўскіх, маскоўскіх князёў XIII-XVII стст. і інш. Най-

[28] Ż. Onacewicz, *Rzut oka na dzieje Wielkiego Księstwa Litewskiego*, [w:] *Pamiętnik Naukowo-Literacki*, Wilno 1849, t. 1, s. 8.

[29] Ż. Onacewicz, *Uwagi nad historią powszechną*, „Magazyn Powszechny”, 1840, nr 11-12, s. 270.

каштоўнейшымі ў калекцыі І. Анацэвіча былі 3 каралінгскія граматы IX ст., 74 граматы на пергаменце і 36 грамат з Кароннага архіва (дзяржаўнага архіва Польскага Каралеўства)[30].

Даследчыкаў Вялікага Княства Літоўскага, вучоных і аматараў, а таксама калекцыянераў старажытнасцяў рукапісная спадчына прафесара Анацэвіча пачала хваляваць яшчэ пры яго жыцці.

Некаторыя матэрыялы сваёй калекцыі, каштоўныя кнігі прафесар сам раздаў знаёмым і вучоным, якіх нават асабіста не ведаў[31]. Частку свайго архіва і бібліятэкі, якія захоўваліся ў Малой Бераставіцы, ён завяшчаў пляменніку Яраславу Анацэвічу, наваградскаму казначэю. Другая частка калекцыі, найбагацейшая і найкаштоўнейшая, што была сфарміравана ў Пецярбургу, пасля смерці вучонага была падзелена на кавалкі і рассеялася па розных руках па свеце: у Расіі, Беларусі, Польшчы. Родныя памерлага намерваліся яе прадаць. Сымон Даўконт неаднаразова дакараў свайго сябра і калегу Тэадора Нарбута, што той яе ўпусціў[32]. Іх карэспандэнцыя сведчыць, што зборы І. Анацэвіча „перайшлі ў рукі тых, хто даваў болей".

Час пацвердзіў высокую навуковую каштоўнасць рукапіснай спадчыны прафесара І. Анацэвіча. Праблема яе рэканструкцыі стала прадметам абмеркавання VI З'езда гісторыкаў, які праходзіў у 1935 г. у Вільні[33]. Пошукі ўцалелых частак збору працягваюцца да сённяшняга дня. Час ад часу здараюцца сенсацыйныя адкрыцці[34].

Навуковую спадчыну вучонага складаюць таксама шэраг рукапісных і друкаваных гістарычных прац. Першая — складзеныя ім генеалагічныя табліцы Пястаў, Рурыкавічаў і Ягелонаў — была гатова да друку ўжо ў Беластоку ў 1816 г. Выдадзены яны былі пазней: у дадатку да працы А. Глябовіча „Кароткі нарыс жыцця Вітаўта, вялікага князя літоўскага"[35] і да выдадзенай І. Анацэвічам

30 F. Pohorecki, *Teki i zbiory Żegoty Onacewicza (Próba rekonstrukcji)*, [w:] *Pamiętnik VI Powszechnego Zjazdu Historyków Polskich w Wilnie 17-20 września 1935 r.*, t. I: *Referaty*, Lwów 1935, s. 416-417.

31 J. Bieliński, *Uniwersytet Wileński (1579-1831)*, t. III, Kraków 1899-1900, s. 283.

32 *Laiškai Teodorui Narbutui: epistolinis dialogas*, parendas R. Griškaite, Vilnius 1996, p. 495.

33 F. Pohorecki, *Teki i zbiory Żegoty Onacewicza...*

34 *Bezcenne polskie rękopisy odnaleziono w Moskwie*, „Życie Warszawy", 22-23 września 1979 r.; N. Iwaszkiewicz, *Bezcenne polonika: Na tropach sensacyjnego odkrycia*, „Literatura", 1979, nr 51-52, s. 12-13; С. Николаев, *Открытие старой коллекции*, „Litwa Radziecka", 1980, nr 12, s. 150-151; С. И. Николаев, *О коллекции Игната Онацевича*, [в:] *Духовная культура славянских народов: литература, фольклор, история: Сборник статей к IX Международному съезду славистов*, Ленинград 1983, с. 197-209.

35 Ż. Onacewicz, *Nota; Genealogia familii Jagiellońskiej*, [w:] A. B. Hlebowicz, *Krótki rys życia Witolda, w. księcia litewskiego*, Wilno 1821, s. 115-122 i tablica.

працы польскага гісторыка Яна Альбертрандзі „Панаванне Генрыха Валуа і Стэфана Баторыя, каралёў польскіх”[36].

Самым „прадукцыйным” у навуковай творчасці вучонага быў віленскі перыяд. Высокую ацэнку Іаахіма Лялевеля атрымала праца І. Анацэвіча, падрыхтаваная ў 1820-1821 гг. у сувязі з удзелам у конкурсе на замяшчэнне пасады прафесара кафедры ўсеагульнай гісторыі. Захаваліся толькі яе фрагменты, надрукаваныя ў 1840 г. у часопісе „Magazyn Powszechny” ў выглядзе аб'ёмнага артыкула „Заўвагі да ўсеагульнай гісторыі”[37].

На працягу 1823-1826 гг. І. Анацэвіч адрэдагаваў і выдаў з уласнымі прадмовамі і каментарыямі дзве працы Я. Альбертрандзі: „Праўленне Генрыха Валуа і Стэфана Баторыя, каралёў польскіх”[38] ды „Праўленне Казіміра Ягелончыка, караля польскага і вялікага князя літоўскага”[39].

Жывучы ў Пецярбургу, вучоны, верагодна, падрыхтаваў рукапіс кнігі „Праўленне Жыгімонта Старога”, які аднак выдаць не змог, а пасля смерці аўтара ён загінуў[40].

У 20-40-я гады XIX ст. у навуковых колах Беларусі, Літвы, Польшчы і Расіі І. Анацэвіч лічыўся галоўным аўтарытэтам у гісторыі Вялікага Княства Літоўскага. Ён выдатна валодаў еўрапейскай гістарыяграфічнай сітуацыяй, меў грунтоўныя веды ў галіне крыніцазнаўства, фенаменальную храналагічную памяць.

Ужо пасмяротна выйшлі ў друку два артыкулы прафесара „Погляд на першапачатковую гісторыю Літвы”[41] і „Погляд на гісторыю Вялікага княства Літоўскага”[42]. Яны з'яўляюцца фрагментамі галоўнай працы яго жыцця — „Гісторыі Літвы”, якую ён цалкам так і не зрабіў.

Нягледзячы на тое, што спадчына Ігната Анацэвіча была апублікаваная толькі ва ўрыўках, яна дазваляе гаварыць аб ім, як аб

36 J. Albertrandy, *Panowanie Henryka Walezjusza i Stefana Batorego, królów polskich*. Wyjęte z rękopismów Jana Albertrandiego, Biskupa Zenopolitańskiego. Przez Żegotę Onacewicza, profesora historii przy Uniwersytecie Wileńskim, t. 1-2, Warszawa 1823.

37 Ż. Onacewicz, *Uwagi nad historią powszechną...*

38 J. Albertrandy, *Panowanie Henryka Walezjusza i Stefana Batorego, królów polskich...*

39 J. Albertrandy, *Panowanie Kazimierza Jagiellończyka, króla polskiego i w. księcia litewskiego.* Wyjęte z rękopismów Jana Albertrandiego. Wydał Żegota Onacewicz, profesor statystyki i dyplomacji w Uniwersytecie Wileńskim, t. 1, Warszawa 1826.

40 *Onacewicz Ignacy (Żegota) Bazyli*, [w:] *Bibliografia literatury polskiej. Nowy Korbut*, t. 5, Warszawa 1967, s. 435.

41 Ż. Onacewicz, *Rzut oka na pierwotne dzieje Litwy*, „Rocznik Literacki”, 1846, t. 3, s. 1-8.

42 Ż. Onacewicz, *Rzut oka na dzieje Wielkiego Księstwa Litewskiego...*

арыгінальным і сур'ёзным айчынным даследчыку.

У вядомых нам працах І. Анацэвіч ахапіў шырокае кола пытанняў тады яшчэ зусім не распрацаванай гісторыі ВКЛ ад старажытнасці да 80-х гадоў XVI ст. Асноўнай жа сферай яго навуковых інтарэсаў былі XIII-XV стст. „Жаласныя цені Рынгольта, Мендога, Альгерда, Кейстута і Вітаўта (...) да гэтага часу чакаюць абнародавання сваіх векапомных спраў", — абгрунтоўваў ён свой храналагічны выбар[43]. Сябе ж ён называў „званаром Гедыміна і Вітаўта".

Вучоны даследаваў палітыку першых вялікіх князёў літоўскіх, месца ВКЛ у сістэме еўрапейскіх міжнародных адносін, генеалогію роду Ягелонаў. Займаўся таксама „жыгімонтаўскай эпохай", пачаткам эпохі выбарных манархаў у Рэчы Паспалітай, яе стасункамі з Рускай дзяржавай, паходамі Самазванцаў, Хмяльніччынай, „вечным мірам" 1686 г. Да ўсіх гэтых тэм ён назапашваў выпіскі і копіі дакументаў, рабіў чарнавыя накіды прац.

Задуманая праца бачылася даследчыку ў трох аб'ёмістых тамах. Сваю працу прафесар збіраўся пабудаваць на магутнай крыніцавай базе, значная частка якой была выяўлена ім самім сярод рукапісаў архіваў і бібліятэк розных краін. Даследчык быў выдатным знаўцам пісьмовых крыніц XIII-XVI стст., першаадкрывальнікам многіх з іх. Ведаў таксама ўсе існуючыя публікацыі крыніц.

І. Анацэвіч распрацаваў класіфікацыю крыніц па гісторыі ВКЛ ад старажытнасці да 1569 г., па наступных групах: міжнародныя трактаты, Метрыка ВКЛ і Кароны, судовыя акты і акты капітул, „Хроніка" Мацея Стрыйкоўскага, „Гісторыя Літвы" Войцеха Каяловіча, трактат Міхалона Літвіна „Аб норавах татар, ліцвінаў і маскавітаў", Галіцка-валынскі летапіс другой паловы XIII ст., тайны архіў крыжакоў з Крулеўца. Важнымі гісторык лічыў таксама „нямыя помнікі", да якіх адносіў руіны замкаў, пахаванні, рэшткі адзення і зброі, урочышчы (напрыклад, гара Міндоўга пад Наваградкам), народныя песні. Вучоны даў характарыстыку гэтых груп крыніц[44].

Сваімі папярэднікамі прафесар лічыў „патрыярха літоўскіх летапісцаў і гісторыкаў" Мацея Стрыйкоўскага, публіцыста Міхалона Літвіна і аўтара „Гісторыі Літвы" езуіта Войцеха Каяловіча. Да прац сваіх папярэднікаў і сучаснікаў І. Анацэвіч ставіўся крытычна. „Працавіты кампілятар Стрыйкоўскі", як яго ацэньваў прафесар, быў вельмі эрудзіраваны, але, кіруючыся жаданнем памножыць

43 J. Albertrandy, *Panowanie Kazimierza Jagiellończyka, króla polskiego i w. księcia litewskiego...*, s. III.

44 Ż. Onacewicz, *Rzut oka na dzieje Wielkiego Księstwa Litewskiego...*, s. 8-13.

нацыянальную славу, а не правесці гістарычную крытыку, паўтарыў больш домыслы, нарабіў памылак. Ён намнога больш аказаў бы нашчадкам карысці, калі б тыя хронікі, што меў у сваім распараджэнні, проста передрукаваў і „ўжывую перадаў іх нашчадкам", а не кампіляваў[45].

І. Анацэвіч таксама крытыкаваў расійскіх гісторыкаў М. Карамзіна і М. Устралава за іх трактоўку гісторыі ВКЛ. У навуковых колах атрымала рэзананс яго выступленне ў 1839 г. на абароне дысертацыі Міхаіла Устралава „Исследование вопроса, какое место в русской истории должно занимать Великое Княжество Литовское", калі ў далікатнай форме прафесар паказаў невуцтва дысертанта і фальсіфікацыю ім фактаў[46].

Затое з вялікай павагай прафесар ставіўся да „вечнай памяці" Яна Альбертрандзі, бо „накрэсленыя яго працавітай рукой творы", на яго думку, унеслі вялікі ўклад у высвятленне шэрагу „цёмных" перыядаў і сюжэтаў гісторыі ВКЛ XV-XVI стст.

Галоўным недахопам кнігі Тэадора Нарбута „Гісторыя літоўскага народа" І. Анацэвіч лічыў некрытычны падыход да крыніц[47].

І. Анацэвіч даў перыядызацыю гісторыі Літвы ад першага ўпамінання гэтай назвы ў 1009 г. да 1569 г. Ён падзяліў яе на наступныя пяць перыядаў:

⇨ 1009-1183 гады — міфічная гісторыя, якая пачынаецца ад першага летапіснага ўпамінання Літвы.

⇨ 1183-1240 гады — няпэўная гісторыя: ад нападаў Літвы на рускія краіны, а менавіта Пскоў і Ноўгарад, да панавання Міндоўга.

⇨ 1240-1386 гады — больш пэўная гісторыя. Змест першай паловы гэтай эпохі складаюць „вялікія клопаты ад крыжакоў". У другой палове, ад панавання Гедыміна, Літва набірае моц і сілу. Гэтая эпоха доўжыцца да часоў увядзення Ягайлам хрысціянскай веры.

⇨ 1386-1447 гады — Літва, пераадолеўшы раздробленасць, знаходзіцца на вяршыні магутнасці.

⇨ 1447-1569 гады — пераход пад уладу Польшчы. Пасля Люблінскага сейма „асобная гісторыя Літвы завяршаецца", і яна „ўліваецца ў гісторыю Польшчы"[48].

У гісторыі ВКЛ, як відаць з гэтай перыядызацыі, І. Анацэвіч выдзяляў тры асноўныя вяхі: пачатак дзяржаваўтваральнага працэ-

[45] Там жа, с. 10.

[46] J. Iwaszkiewicz, *Ignacy Żegota Onacewicz — historyk Litwy...*, с. 101.

[47] R. Ramanauskas, *Onacevięius apie T. Narbuto „Lietuviu Tautos Istori¹"*, [в:] *История*, ч. 29: *Некоторые проблемы истории Литовской ССР*, Вильнюс 1988, с. 43-44.

[48] Ż. Onacewicz, *Rzut oka na pierwotne dzieje Litwy...*, с. 7-8.

су, якія супаў з прыходам да ўлады Міндоўга; Крэўскую і Люблінскую уніі.

У паказе першабытнай гісторыі Літвы І. Анацэвіч быў рамантыкам. У трактоўцы „больш пэўных" часоў, якія пачаліся з праўлення Міндоўга, ён ужо прытрымліваўся навуковых прынцыпаў, і рамантызм толькі часам прабіваецца звонкі. Калі мы апусцім фантастычныя гіпотэзы І. Анацэвіча аб сваяцтве герулаў з літвінамі, аб паходжанні Рурыка са Жмудзі або аб удзелах літвінаў у нарманскіх марскіх паходах, ці то залічэнне крывічоў да літоўскіх плямёнаў, якія датычаць першага перыяду гісторыі Літвы, ім самім названага „міфічным", то далей мы маем рэканструкцыю храналагічна паслядоўнай і навукова абгрунтаванай карціны падзей на тэрыторыі Беларусі і Літвы. Асноўную ўвагу ў сваіх навуковых працах І. Анацэвіч удзяляў дзяржаўна-палітычнай гісторыі.

Вялікае значэнне ў рэканструкцыі айчыннай мінуўшчыны гісторык надаваў генеалогіі вялікіх літоўскіх князёў, вельмі заблытанай да часоў Віценя. Прычыну генеалагічнай блытаніны ён тлумачыць „рэлігійнай неразбярыхай". Ён абверг легенды аб рымскім паходжанні літоўскіх князёў, аб паходжанні Міндоўга, Віценя і Гедыміна ад полацкага князя Ізяслава Уладзіміравіча, сына Рагнеды. На падставе пісьмовых крыніц даследчык рэканструяваў радавод вялікіх літоўскіх князёў у яго легендарнай (да Рынгольта) і рэальнай частцы.

І. Анацэвіч аддае па заслугах дзеячам мінулых эпох. Вітаўт, паводле яго ацэнкі, — „адзін з найслаўнейшых і наймагутнейшых манархаў сярэднявечча", які „пераўзыходзіў сваіх сучаснікаў мужнасцю, розумам і палітыкай". „Шчасцем для Польшчы" лічыць гісторык тое, што Генрых Валуа яе „пакінуў дзеля новага разліцця крыві ўласных падданых". Стэфан Баторый — найвялікшы кароль свайго часу, здольны „надаць Еўропе іншы палітычны кшталт".

Сукупнасцю сваіх публікацый прафесар І. Анацэвіч стварыў цэласную арыгінальную навуковую карціну гісторыі ВКЛ ад старажытнасці да канца XVI ст. Некаторыя элементы распрацаванай ім канцэпцыі пазнейшая беларуская і літоўская гістарыяграфія паклала ў аснову ўласнага бачання далюблінскай гісторыі сваёй краіны і народа.

Выкладаннем ва універсітэце і навуковымі публікацыямі вучоны рабіў беларускую і літоўскую гісторыю набыткам многіх людзей і быў першым, хто ўздымаў гістарычную культуру сваіх землякоў. Уведзены ім у навуковае абарачэнне фактычны матэрыял стаў хрэстаматыйным і сёння ў значнай ступені ўваходзіць у падручнікі гісторыі. „Найвялікшы ў нас знаўца літоўскай гісторыі, які

ў яе разуменні мог узняцца над голымі фактамі, ахапіць яе цалкам у сувязі з дзейнасцю іншых народаў і падвергнуць суровай крытыцы яе сумнеўныя нормы", — канстатаваў выдаўца пецярбургскага „Rocznika Literackiego"[49]. Прагрэсіўныя, для свайго часу смелыя, цікавыя, навукова абгрунтаваныя погляды І. Анацэвіча і сёння актуальныя для гістарычнай навукі.

Французскі гісторык Аўгусцін Цьеры сцвярджаў у 1822 годзе, што менавіта гісторыя накладзе свой адбітак на XIX стагоддзе і дасць яму сваё імя, як філасофія дала сваё імя XVIII стагоддзю[50]. Прафесар І. Анацэвіч быў адным з першых беларусаў, якія XIX стагоддзе рабілі стагоддзем гістарычнай навукі ва Усходняй і Цэнтральнай Еўропе.

Задуманая вучоным капітальная гісторыя Беларусі і Літвы магла стаць буйным гістарыяграфічным фактам, а сам ён меў усе дадзеныя, каб заняць пачэснае месца ў еўрапейскай навуцы. Аднак пры саліднай навуковай падрыхтоўцы і багацці матэрыялаў, якімі валодаў, І. Анацэвіч гэтай працы не пакінуў. Не дзіўна, што вучоны свет адмаўляецца ў гэта верыць. Упарта ходзяць чуткі, што сваю гісторыю ВКЛ ён перадаў І. Крашэўскаму. Адхіленне ў 1821 годзе ад кіраўніцтва кафедрай гісторыі і ад чытання гістарычных курсаў не спрыялі стварэнню гэтай працы. Катастрофа 1828 г., канфіскацыя часткі сабраных матэрыялаў, жыццё ў высылцы, шматгадовае знаходжанне пад судом выключылі магчымасць паўнацэннага працягу працы над гісторыяй ВКЛ.

У Пецярбургу ж яго ахапіла манія калекцыяніравання крыніц. У працэсе камплектавання матэрыялаў для гісторыі ВКЛ І. Анацэвіч патануў у масе сабраных ім дакументаў, апрацоўка якіх па меры іх назапашвання станавілася ўсё больш цяжкай. Замест сканцэнтравання сіл на сваёй галоўнай задуме, рассейваўся ў пагоні за ўсё новай і ўсё больш цікавай тэмай. Перакідваўся ад першабытнай гісторыі Літвы да Ягелонскіх часоў, ад гэтай тэмы да эпохі Жыгімонтаў. То яго спакушалі адносіны Рэчы Паспалітай з Рускай дзяржавай, паходы Ілжэдзмітрыяў, то захоплівалі казацкія справы. Да ўсіх гэтых тэм ён назапашваў копіі, выпіскі, рабіў чарнавыя накіды прац. Збіранне матэрыялаў стала ў яго свайго роду звычкай. Увесь час дабіраў, шукаў, бесперапынна даследаваў, правяраў. Але далей збірання часам справа і не ішла, да апрацоўкі матэрыялу ён так і не прыступіў. Па словах С. Даўконта, гэта быў вучоны, „які другіх заахвочваў, а сам мала рабіў".

49 Там жа, старонка без нумарацыі.

50 Л. П. Репина, В. В. Зверева, М. Ю. Парамонова, *История исторического знания*, Москва 2004, с. 156.

Хоць сам І. Анацэвіч не напісаў капітальнай працы, але даў магутны імпульс іншым і быў надзвычай шчодры ў прадстаўленні калегам сабраных матэрыялаў і ў падмацаванні чужых прац сваёй незвычайнай эрудыцыяй. Яго бескарыслівай дапамозе абавязаны завяршэннем сваіх прац па гісторыі ВКЛ І. Даніловіч, І. Ярашэвіч, М. Баброўскі, М. Гамаліцкі, С. Даўконт, Т. Нарбут, Р. Каранёўская і шмат іншых.

Застаецца толькі шкадаваць, што беларускі гісторык І. Анацэвіч, галоўны ва Усходняй і Цэнтральнай Еўропе 20-40-х гадоў XIX ст. аўтарытэт у гісторыі ВКЛ, не даў еўрапейскай навуцы таго, чаго ад яго чакаў навуковы свет Беларусі, Літвы і Польшчы. З тых фрагментаў, якія захаваліся да нашага часу, можна заключыць, што мы засталіся без масштабна задуманай, капітальнай для свайго стагоддзя працы. Гэтым, як сказаў у 1840 г. Х. А. Скімбартовіч, І. Анацэвіч вінаваты не толькі перад уласным краем, але і большай часткай адукаванай Еўропы[51].

Напярэдадні важнага і адказнага этапу свайго этнагенезу — этапу складвання ў нацыі — беларусы і літоўцы, дзякуючы руплівай працы прафесара І. Анацэвіча, былі недалёкія ад таго, каб займець уласную раннюю нацыянальную гісторыю, убачыць сваё месца на еўрапейскай сцэне, але гэтага не атрымалі. Час быў упушчаны, змянялася грамадска-палітычная сітуацыя. Беларуская гістарыяграфія, якая толькі пачала падаваць свой голас, была заціснута паміж больш моцнай расійскай і польскай гістарыяграфіяй. Гэта паспеў адчуць і сам гісторык, які 30 студзеня 1839 г. пісаў з Пецярбурга Адаму Йохеру пра „вельмі неспрыяльныя часы”, калі набірае сілу тэндэнцыя забараніць друкаванне твораў, „якія дазваляюць пазнаць веліч працы і здольнасць нашых продкаў”[52].

Разам з тым энергічная навуковая дзейнасць прафесара І. Анацэвіча, які звярнуў увагу на феномен дзяржавы сваіх продкаў і вярнуў з небыцця шэраг гістарычных асоб, закладала фундамент крытычнага навуковага вывучэння ВКЛ і дакументальных помнікаў яго гісторыі, увяла ў навуковае абарачэнне вялізныя, невядомыя раней пласты гістарычнай інфармацыі, спрыяла станаўленню беларускай і літоўскай гістарычнай навукі. Ён, аўтарытэтны знаўца гісторыі краю і помнікаў яго мінулага, стаў адным з архітэктараў гістарычнага мыслення інтэлігенцыі Беларусі і Літвы.

51 J. Iwaszkiewicz, *Ignacy Żegota Onacewicz — historyk Litwy...*, c. 118.

52 *Ign. Onacewicz do Ad. Jochera [Z Moskwy, 30 grudnia 1839]*, [w:] *Materiały do dziejów literatury i oświaty na Litwie i Rusi*, wyd. T. Turkowski, Wilno 1937, t. 2, s. 271.